**Дубровенскі, Л.** Навечна ў памяці людской / Л. Дубровенкі // Дняпроўская праўда (Дуброўна). — 1997. — 22 лют. — С. 3.

## НАВЕЧНА Ў ПАМЯЦІ ЛЮДСКОЙ

Углядзіцеся, сябры, у твары гэтых юнакоў. Якія яны чыстыя і светлыя, якія маладыя! І такімі для ўсіх, хто ведаў, любіў і памятае іх, яны застануцца назаўсёды. Так, такая суровая рэчаіснасць: гэтых юнакоў – воінаў-інтэрнацыяналістаў – ужо няма сярод нас.

...Аляксандр Дзікараў. Яго па праву можна смела назваць выхаванцам добраахвотнага таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту (была яшчэ нядаўна такая арганізацыя ДТСААФ). Аляксандр скончыў сярэднюю школу № 2 Дуброўна і па прапанове райваенкамата стаў курсантам Віцебскага вучэбна-авіяцыйнага цэнтра ДТСААФ. Працаваў і адначасова асвойваў прафесію верталётчыка.

Ужо ў званні малодшага лейтэнанта падаў рапарт аб залічэнні яго ў кадры Узброеных Сіл краіны. Потым было Саратаўскае вышэйшае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў, год службы ў лінейнай часці і – Афганістан. Тады на календары быў яшчэ 1982 год і аб нашых сынах-героях мы ведалі вельмі мала.

А ў той час Аляксандр Дзікараў, лётчык-штурман баявога верталёта, не раз рызыкаваў сваім жыццём. Яму часта даводзілася выконваць баявыя заданні ў гарах, сярод цяснін, дзе душманы спрабавалі дастаць баявую машыну, ляцеўшую на нізкай вышыні, са звычайна ў вінтоўкі ці аўтамата, а то і гранатай. Аднойчы, кіруемая ім машына села на міннае поле (так патрабавала баявая абстаноўка), добра – абышлося, выручыў набыты вопыт баёў.

За кароткі тэрмін нашага земляка двойчы накіроўвалі на дапамогу афганскаму народу (гэта толькі цяпер вядома, што гэта была за вайна і каму яна была патрэбна). І савецкі афіцэр Аляксандр Віктаравіч Дзікараў чэсна і з гатоўнасцю выконваў даручэнне Радзімы, камандавання, аб чым сведчаць баявыя ўзнагароды – ордэны «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені і Чырвонай Зоркі. Далейшую службу праходзіў у Групе савецкіх войскаў у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы.

І добра ўсё складвалася ў жыцці гэтага мужнага, загартаванага дубровенца: была навек палюбіўшаяся ваенная прафесія, сям'я і любая жонка... Усё абарвалася ў трагічным здарэнні.

У кароткім жыцці Аляксандр Дзікараў нават добра і не пацешыўся ўволю сваім сынам, якога яму пашчасціла крыху патрымаць на руках...

Мікалай Ісакаў жа і гэтага не паспеў: лёс адмераў яму крыху больш дваццаці гадкоў. Ён нарадзіўся і рос у вёсцы Каробкі Валяўкоўскага сельсавета. Бацькі яго простыя сяляне. Пасля васьмі класаў Мікалай падаўся на вучобу ў Смаленск, атрымаўшы спецыяльнасць слесара-мантажніка, крыху папрацаваў. Праз год яго прызвалі ў рады Савецкай Арміі.

Тэрміновую службу М. Ісакаў пачаў у адной з воінскіх часцей, што размяшчалася ў Літве, а спынілася яна – датэрмінова і назаўсёды – у горных цяснінах Афганістана. Здарылася гэта ў красавіку 1984 года.

Вясной, калі ўжо добра бачна абуджэнне прыроды да новага жыцця пасля зімовай спячкі, у сям'ю цялятніцы Кацярыны Яўціхіеўны і шафёра Івана Макаравіча Ісакавых прыйшло страшнае паведамленне: у далёкім Афганістане, выконваючы інтэрнацыянальны абавязак, смерцю героя

загінуў іх адзіны сын Мікалай. Няма такіх слоў, каб апісаць зваліўшаеся на бацькоў гора. Больш стойка, калі так можна сказаць, пераносіў жудасную вестку Іван Макаравіч. Затое ён стаў больш замкнутым, менш гаваркім. Ды, бачна, смерць сына падарвала здароўе сціплага саўгаснага працаўніка, яго сэрца спыніла свой ход, ён пахаваны побач з сынам. А ў доме Ісакавых толькі фотакартка Міколы ды ордэн Чырвонай Зоркі нагадваюць пра воіна-героя.

...Нічым не вымераць той колькасці слёз, якія пралілі іх маці і праліваюць па сённяшні дзень. Іх сыноў з таго свету не вярнуць. Пра такое звычайна кажуць: «служба іх... спынілася... назаўсёды».

Не! Гэта не так, бо гэтыя слаўныя хлопцы і зараз служаць сваёй Радзіме... Прыкладам сваім, сваёй вернасцю салдацкаму абавязку.

**Л. Дубровенскі**